# ГАЗЕТЫ З МУЛЬТЫМЕДЫЙНЫМ ІНТЭРАКТЫВАМ,

## або Як рэдакцыі Магілёўскай вобласці выходзяць за рамкі гарадскіх і раённых выданняў

**У канцы лістапада на Магілёўшчыне ў сферы масмедыя адбыліся дзве вельмі важныя падзеі — у Шклове запрацаваў абноўлены партал раённай газеты «Ударны фронт» shklovinfo.by з унікальнымі магчымасцямі, а ў Бабруйску газета «Бабруйскае жыццё» прэзентавала паўнавартаснае тэлебачанне.**

Попыт на папяровыя версіі выданняў у наш час імкліва памяншаецца, навіны хутчэй знаходзяць чытача праз электронныя каналы. І выдаўцы, якія думаюць пра заўтрашні дзень, спяшаюцца перабудавацца на новыя рэйкі.

Электронная версія шклоўскай раённай газеты «Ударны фронт» — зараз не проста насычаны навінамі сайт, гэта вельмі карысны шматфункцыянальны інтэрнэт-рэсурс.

— Нас на гэта натхніў пошук новых формаў прасоўвання газеты, разважанні, што будзе з намі далей, праз 5—10 гадоў, — расказвае **галоўны рэдактар газеты «Ударны фронт» Павел САВЕЛЬЕЎ.** — Трэба думаць, як на сайце можна зарабіць. Пакуль, як правіла, толькі трацімся на яго хостынг. Мы ставім задачу манетызаваць сайт за кошт аказання розных карысных паслуг. Напрыклад, размяшчэння дошкі аб'яў накшталт вядомага kufar.by, дзе можна нешта прадаць або купіць. Механізм той жа самы. Даеш аб'яву, рэгіструешся і можаш кантактаваць з іншымі. У распрацоўцы схема каталога вакансій для ахвотных знайсці працу, каб яны змаглі размясціць сваё рэзюмэ. Працуем над каталогам нашых арганізацый, каб яны мелі магчымасць прадстаўляць у нас свае старонкі і расказваць пра сябе. Свой сайт складана трымаць у наш час, а мы можам прасоўваць іх і за нейкую суму абнаўляць.

Наогул, збіраемся напоўніць наш партал па максімуме карыснай інфармацыяй: дзе можна смачна і танна паабедаць або як і дзе цікава і з карысцю адпачыць. Варыянтаў безліч. Плюс зарабляем за конт выдавецкай дзейнасці і на продажы пдф-версій газеты. У электронным выглядзе яна каштуе на сённяшні дзень усяго 30 капеек. Эканомія адбываецца за кошт паслуг друкарні і паперы. Акрамя гэтага мы працуем без пасрэдніка. Заключылі праз сістэму АРІП дагавор з Нацбанкам і атрымалі магчымасць наўпрост прадаваць электронную версію праз інтэрнэт-банкінг.

Знешні від і канцэпцыю партала шклоўскай газеце дапамагалі распрацаваць гомельскія праграмісты. На ўзбраенне ўзяты вопыт «Гомельскай праўды», на рэалізацыю праекта спатрэбілася каля паўгода. Увесь гэты час галоўны рэдактар шклоўскай газеты быў на прамой сувязі са спецыялістамі, выязджаў да іх або яны прыязджалі ў Шклоў. Абноўлены сайт выйграе яшчэ за кошт таго, што ім займаецца не адзін чалавек, а ўся рэдакцыя. Карэспандэнты дадаюць навіны, галоўны бухгалтар размяшчае інфармацыю для рэкламадаўцаў — кожны адказвае за свой участак. Асобны блок адведзены мясцоваму тэлебачанню. Тэлевізійнікі таксама маюць магчымасць самастойна абнаўляць інфармацыю і ставіць папулярнае відэа.

— Ім выгадна, каб іх у інтэрнэце глядзелі, а для нас гэта важны мультымедыйны кантэнт, — разважае Павел Савельеў. — Калі шмат фота і відэа, гэта таксама прыцягвае. Вось купілі спецыяльнае абсталяванне, каб рабіць панарамныя здымкі і паказваць прыгажосць нашага краю. Да таго ж мы плануем не абмяжоўвацца мясцовымі навінамі.

Пра вопыт яшчэ аднаго флагмана масмедыйнай прасторы вобласці — газету «Бабруйскае жыццё» «Звязда» ўжо пісала. За кароткі час выданне са стратнага ператварылася ў прыбытковае. Істотна змяніўся сайт, з'явілася сваё FM-радыё, а цяпер яшчэ і поўнафарматны гарадскі канал «Бабруйск 360». Перадачы канала цяпер можна глядзець з шасці раніцы да гадзіны ночы.

— Журналісты нашага аддзела тэлерадыёвяшчання рыхтавалі сюжэты для праграмы «Сёння ў Бабруйску», якая пакуль яшчэ выходзіць на канале «Беларусь 4 Магілёў». Але ў нейкі момант зразумелі — 10 хвілін мала, каб расказаць пра жыццё горада. І вырашылі стварыць свой канал. Ініцыятыва была падтрымана Бабруйскім гарвыканкамам. Так і з'явіўся «Бабруйск 360», — паведаміў **галоўны рэдактар «Бабруйскага жыцця» Вадзім ШЧАГЛОЎ.**

40 працэнтаў сродкаў на тэлебачанне вылучыў заснавальнік выдання — Бабруйскі гарвыканкам. Усе астатнія выдаткі ляглі на холдынг. Платформай для вяшчання стаў адзін са сталічных каналаў. Акрамя аўтарскіх праектаў гледачы могуць паглядзець кіно, забаўляльныя шоу-праграмы. Далучыцца да бабруйскіх навін могуць не толькі бабруйчане, але і ўсе жыхары Магілёўскай вобласці праз інтэрактыўны пакет каналаў Белтэлекама «Zala».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

■ Рэгіёны

# АМАЛЬ 100 ТЫСЯЧ ЕЎРА — НА НАВУКУ

**Палескі дзяржаўны ўніверсітэт атрымаў грант па праграме тэрытарыяльнага супрацоўніцтва краін «Усходняга партнёрства» «Беларусь — Украіна» (ЕаРТС). Пра гэта паведаміла загадчык кафедры эканомікі і арганізацыі вытворчасці Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта Людміла СОВІК.**

Грантавы кантракт быў падпісаны на мінулым тыдні ў Кіеве.

Як паведамляе БЕЛТА, праект «Фарміраванне прадпрымальніцкага асяроддзя па вытворчасці арганічных ягад у трансгранічных раёнах Беларусі і Украіны» пінчане будуць рэалізоўваць сумесна са сваімі партнёрамі з Нацыянальнага ўніверсітэта воднай гаспадаркі і прыродакарыстання (горад Роўна, Украіна). Сума гранта для беларускага боку складзе 96 тысяч еўра, для ўкраінскага — каля 70 тысяч еўра.

Частку сродкаў накіруюць на маркетынгавае даследаванне рынку ягадных культур. Таксама пінскія навукоўцы і іх ровенскія калегі распрацуюць рэкамендацыі па арганічных тэхналогіях вырошчвання ягад. З прапанаванымі методыкамі прадпрымальнікі змогуць азнаёміцца на сайце, наведваючы адукацыйныя мерапрыемствы і трэнінгі. «Будуць арганізаваны паездкі беларускіх фермераў ва Украіну на арганічныя вытворчасці, каб яны паглядзелі, што і як робіцца. Запросім украінцаў для пераймання нашага вопыту. Акрамя таго, раскажам пра патрабаванні ЕС да арганічных вытворчасцяў», — падкрэсліла Людміла Совік.

Праект тэрытарыяльнага супрацоўніцтва разлічаны на 14 месяцаў. Да яго рэалізацыі партнёры ўжо прыступілі. «Разлічваем, што будуць закладзены плантацыі з беларускіх і ўкраінскіх саджанцаў, а раней невыкарыстоўваемыя землі будуць уключаны ў гаспадарчы абарот з высокапрадукцыйнымі раслінамі. Таксама мы чакаем, што пасля заканчэння праекта некаторыя нашы фермеры будуць гатовы сертыфікаваць сваю вытворчасць па стандартах ЕС», — адзначыла загадчык кафедры.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# Праз мост у Жыткавіцкім раёне дазволены рух пешаходаў

**Вечарам 7 снежня ў Жыткавічах адбылося выязное пасяджэнне камісіі па надзвычайных сітуацыях пры Гомельскім аблвыканкаме. Па выніках абмеркавання прынята рашэнне дазволіць рух пешаходаў па мосце цераз Прыпяць, паведамілі ў МНС.**

Паромная пераправа для легкавых аўтамабіляў у раёне вёскі Снядзін Петрыкаўскага раёна пераведзена на кругласутачны рэжым работы. Пачаты работы па ўладкаванні часовай дарогі ад вёсак Чэрнічы і Боркі да Прыпяці, арганізавана падсыпка і грэйдзіраванне грунтавой дарогі да вёскі Снядзін.

Праезд велікагрузных транспартных сродкаў арганізаваны па рэспубліканскіх дарогах праз Жыткавічы (М-10) — Калінкавічы (Р-131) — Мазыр (Р-36) — Лельчыцы (Р-128) — Тураў і праз Жыткавічы (М-10) — Пінск (Р-6) — Столін (Р-88) — Давыд-Гарадок — Тураў.

Жыткавіцкае райспажыўтаварыства арганізуе бесперабойную падачу харчовых і нехарчовых тавараў у філіял Тураўскі каапгандаль Жыткавіцкага райспажыўтаварыства, Жыткавіцкая цэнтральная раённая бальніца ўзгаднілa з калегамі з Лельчыц экстранную дастаўку цяжкахворых (у выпадку неабходнасці) з бальніцы Турава.

На месца накіроўваецца спецыялісты пантонна-маставога батальёна Міністэрства абароны для ацэнкі становішча. Працягваецца далейшае абследаванне канструкцый моста для выпрацоўкі аптымальнага рашэння.

Нагадаем, што 7 снежня ў 12.20 у МНС ад відавочцы паступіла паведамленне аб тым, што на трасе Р-88 Жыткавічы — Давыд-Гарадок — мяжа Украіны, назіраецца расколіна ў канструкцыі моста цераз раку Прыпяць. Мост даўжынёй 888,7 метра, яго шырыня 10 метраў. У аператыўным рэжыме рух быў перакрыты, а МНС арганізавала смс-апавяшчэнне жыхароў Жыткавіцкага, Лунінецкага, Лельчыцкага, Столінскага, Салігорскага раёнаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Работа з выканаўчымі дакументамі спросціцца

**Спектр выканаўчых дакументаў, якія беларусы і расіяне змогуць самі прад'яўляць на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы, пашырыцца. Работа над гэтым вялася два гады і неўзабаве будзе завершана.**

— Сёння рашэнні эканамічных судоў і дакументы ў сферы спагнання аліментаў прад'яўляюцца на тэрыторыі Расіі ў спрошчаным парадку, — расказаў **Алег СЛІЖЭЎСКІ, міністр юстыцыі Беларусі.** — Мы вырашылі пашырыць спектр гэтых дакументаў, каб патрабавальнікі маглі напрамую звярнуцца ў орган прымусовага выканання на тэрыторыі іншай дзяржавы і пазбегнуць залішніх бюракратычных працэдур.

На днях ад расійскіх юрыстаў быў атрыманы іх варыянт пагаднення, якое неўзабаве будзе падпісана. Ну думку Алега Сліжэўскага, «гэта значна спросціць прад'яўленне дакументаў на тэрыторыі абедзвюх дзяржаў і значна скароціць тэрміны для прыняцця мер па прымусовым выкананні».

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

# НОВЫ ГРАФІК РУХУ ЦЯГНІКОЎ

**На дарогах краін Садружнасці і Еўразаюза новы графік руху цягнікоў на 2017/2018 год пачне дзейнічаць з нуля гадзін 10 снежня, нагадалі ў прэс-службе магістралі.**



Пры фарміраванні графіка Беларускай чыгункай удзялялася ўвага захаванню існуючых актуальных для пасажыраў напрамкаў у зносінах з краінамі СНД і Балтыі і пашырэнню маршрутнай сеткі як у міжнародных зносінах, так і ўнутры краіны.

У міжнародных зносінах графікам руху цягнікоў на 2017/2018 год прадугледжаны наступныя змяненні.

Рэгулярныя транспартныя зносіны паміж Мінскам і Вільнюсам з 10 снежня будуць забяспечвацца сучаснымі электрацягнікамі як фарміравання Беларускай чыгункі, так і фарміравання Літоўскіх чыгунак. Без змянення часу знаходжання ў дарозе (2 гадзіны 30 хвілін) пагранічны і мытны кантролі з цягнікамі № 805/806 і № 804/807 у зносінах Мінск—Вільнюс будуць праводзіцца на станцыі Гудагай.

Сумесна з Польскімі чыгункамі арганізаваны штодзённыя перасадачныя зносіны Мінск—Брэст—Варшава, якія звяжуць сталіцы дзвюх суседніх дзяржаў — Беларусі і Польшчы. Расклад новых цягнікоў № 127/128 Брэст—Варшава—Брэст і № 728/727 Брэст—Мінск—Брэст узгоднены па часе для перасадкі пасажыраў на станцыі Брэст-Цэнтральны пры руху ў абодвух напрамках. Пагранічная і мытныя аперацыі ў саставе цягніка Польскіх чыгунак будуць праводзіцца на станцыі Брэст-Цэнтральны, пры гэтым пасажырам неабходна перайсці з саставу ў састаў, якія знаходзяцца на суседніх пуцях каля адной платформы.

З улікам попыту на перавозкі ў летні перыяд 2018 года прадугледжаны цягнік № 451/452 Мінск—Варна. Частата звароту гэтага цягніка павялічана з 8 да 16 рэйсаў. З Мінска цягнік будзе адпраўляцца 10,15, 22, 27 чэрвеня, 4, 9,16, 21, 28 ліпеня, 2, 9,14, 21, 26 жніўня, 2, 7 верасня, у зваротным напрамку з Варны цягнік будзе адпраўляцца 12, 17, 24, 29 чэрвеня, 6, 11, 18, 23, 30 ліпеня, 4, 11, 16, 23, 28 жніўня і 4, 9 верасня.

У летні перыяд штодня будзе курсіраваць цягнік № 94/93 Мінск—Адэса, а таксама прадугледжаны штодзённыя зносіны паміж Мінскам і Херсонам, Мінскам і Бярдзянскам за кошт арганізацыі бесперасадачных вагонаў.

Для ўстанаўлення рэгулярных кругласезонных чыгуначных зносін паміж Мінскам і Кішынёвам арганізавана курсіраванне бесперасадачных вагонаў фарміравання Беларускай чыгункі.

У рэгіянальных зносінах прадугледжваецца пашырэнне маршрутнай сеткі цягнікоў бізнес-класа за кошт уводу абаротнае цягнікоў Мінск—Полацк—Мінск і Мінск—Ліда—Мінск.

Таксама аптымізавана схема абслугоўвання ўчасткаў Мінск—Маладзечна—Гудагай за кошт падаўжэння маршрутаў электрацягнікоў Мінск—Маладзечна да Гудагая і станцый участка Маладзечна—Гудагай. Пасажыры, якія едуць у гэтым напрамку, змогуць штодня ажыццяўляць свае паездкі без перасадкі на станцыі Маладзечна.

Больш падрабязна з раскладам руху цягнікоў можна азнаёміцца ў чыгуначных касах, па тэлефонах даведачных службаў, а таксама на сайце Беларускай чыгункі www rw.by.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*